6. 马贝加. 近代汉语介词[M]. 北京: 中华书局, 2002. (Ма, Бэйцзиа. Предлог в современном китайском языке / Ма Бэйцзиа. – Пекин : Изд-во Китайская книга, 2002).
7. 陈 昌来. 介词与介引功能[M]. 合肥: 安徽教育出版社, 2002. (Чень, Чаньлай. Предлог и его функция / Чаньлай Чень. – Хэфэй ; Аньхой : Изд-во образования, 2002).

*Г. У. Федарэнка (Беларусь)*

## ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ПАРАДКАВЫХ ЛІЧЭБНІКАЎ У РОЛІ ДЗЕЙНІКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ XIV–XVII СТСТ.)

Асноўнае значэнне парадкавых лічэбнікаў – абазначэнне парадку каго- ці чаго-небудзь пры падліку. Такія словы ў беларускай мове граматычна звязаны з колькаснымі лічэбнікамі і прыметнікамі. У далёкім мінулым большасць іх утваралася шляхам далучэння прыметнікавага канчатка да асновы колькаснага лічэбніка. Таму граматычныя і сінтаксічныя асаблівасці парадкавых лічэбнікаў і прыметнікаў супадаюць.

Асобна ці ў спалучэнні з іншымі часцінамі мовы парадкавыя лічэбнікі выконваюць ролю любога галоўнага або даданага члена сказа, але найчасцей з'яўляюцца азначэннем. Быць жа сродкам выражэння дзейніка яны могуць у залежнасці ад спецыфікі іх функцыянавання ў структуры простага сказа.

Зыходным матэрыялам для даследавання паслужылі рознажанравыя помнікі старабеларускай пісьменасці XIV–XVII стст. Выбраны з іх матэрыял для аналізу дазваляе выявіць структурныя формы выражэння парадкавых лічэбнікаў у якасці дзейніка:

1. Функцыянаванне парадкавых лічэбнікаў у складзе цэльных канструкцый. Сінтаксічная спаянасць такіх непадзельных спалучэнняў праяўляецца толькі ў кантэксце, дзе словазлучэнні выступаюць як адзін член сказа. Для больш дакладнага паведамлення аб дзеючай асобе дзейнік, выражаны словазлучэннем, у склад якога ўваходзіць парадкавы лічэбнік з семантыкай індывідуальнай намінацыі, як правіла, называе прывілеяваных асоб і іх тытул: ***король его м(и)л(о)сть Жыкгимо***$^{нт}$ ***Пе***$^{р}$***шыи*** *на вечные часы надал* (ПГ, III, 3, 1506); ***г***$^{с}$***дръ кро***$^{л}$ ***по***$^{л}$***ски***$^{s}$ ***Жикгимон***$^{т}$ ***трети***$^{s}$ *послалъ гонца ... до Москвы* (Барк., 171); ***Иwанъ трына***$^{д}$***цаты***$^{и}$ ***папежъ кролевски***$^{и}$ ***сынъ*** *былъ чтыри лета папежомъ* (Царств., 74); ***Болесла***$^{в}$ ***четве***$^{р}$***ты***$^{s}$ ***ке***$^{н}$***деравы***$^{s}$ *або кидравы*$^{s}$ (Хр. польск., 9); ***владисла***$^{в}$ ***четве***$^{р}$***ты***$^{s}$ *з ласки божеи* ***коро***$^{л}$ ***по***$^{л}$***ски***$^{s}$ (Дыяр., 176).

Заслугоўвае ўвагі і ўтварэнне некаторых дробавых лікаў, якія па структуры складаюцца з некалькіх кампанентаў і выражаюцца словазлучэннем 'парадкавы лічэбнік + назоўнік *часть*'. Зафіксаваныя яны ў помніках дзелавога жанру, бо менавіта ў такіх тэкстах найчасцей адлюстроўваўся факт падзелу на часткі маёмасці, спадчыны і да т.п.: ***третѦѦ часть*** *... по дА*$^{д}$*ки ихъ прышла на нихъ прирожонымъ спа*$^{д}$*комъ* (КВС, 504б, 1552); ***четвертаѧ часть*** *водлигъ давныхъ правъ wсобливе на выправи девокъ замижъ wтложона* (Ст. 1588, 28б).

Адзначаны парадкавыя лічэбнікі ў ролі дзейніка і ў складзе ўстойлівых слоўных комплексаў. Напрыклад, тэрміналагічнае спалучэнне тыпу *особа третея* са значэннем 'асабіста не зацікаўлены ў чым-н., што датычыцца дзвюх іншых асоб; пабочны', якое адзначана ў помніку дзелавога зместу XVII ст. як: ***особа третея****, до той справы неналежная, право мое розрываеть* (АСД, VIII, 227, 1617).

Выяўлены ў якасці галоўнага члена сказа і такія спалучэнні як *одинъ другого, одинъ другому*, якія складаюцца з колькаснага лічэбніка *одинъ* і парадкавага лічэбніка *другой.* Губляючы значэнне дакладнай колькасці ці парадку пры падліку, яны могуць у залежнасці ад кантэксту ўжывацца як прыслоўе

‘ўзаемна; які праяўляецца ў адносінах адзін да аднаго’, а ў сказе пры выказніку, выражаным дзеясловам у множным ліку, выконваць ролю дзейніка, паколькі, на нашу думку, дзеянне ажыццяўляецца абедзвюма асобамі: *на смерть **ѡдинъ дригого** забиѫють* (Ст. 1588, 408); *заразъ **одинъ другого** яко на рѣзь выдають* (АЮЗР, I, 286, 1598); ***одинъ другого** есмо зъ стану малъженского выпустили* (ИЮМ, VIII, 315, 1611); ***одинъ другому** перешкоду въ торгу тыхъ рыбъ, цену подвышаючи, подступъ чынивали* (ИЮМ, VIII, 396, 1623).

2. Функцыю дзейніка парадкавыя лічэбнікі маглі выконваць і самастойна, не ўтвараючы словазлучэння. Гэта адбываецца пры ўмове субстантыўнага пераасэнсавання, калі лічэбнікі здольныя ўжывацца ў сказе як назоўнік, выконваць функцыю назоўніка ў спалучэнні *лічэбнік + назоўнік*, дзе апошні не называецца, але падразумяваецца, таму што ўзгадваўся раней. У выніку двухслоўнае выражэнне прадмета і яго колькасці замяняецца аднаслоўным. Такім чынам субстантывацыя ўносіць у семантыку парадкавага лічэбніка значэнне асобы, якая займае пэўнае месца ў лічыльным радзе: ***третии** суть друзи жениховы, а **четъвер$^{s}$тыи** дружина невестина* (Скар. ПП, 2); ***першій** бовѣмъ тер$^{s}$пливости мнлъ оуказаніе, а **вторы** цр$^{с}$тва божего клейноты приноси* (Каз. Кір., 2–2б); *зачи$^{м}$ одны выгнани, **дригіе** иманы, **третіи** биты, **четвертые** везенье$^{м}$ и иншими томи подо$^{б}$ными прикрыми постипками сить траплени* (Апакр., 208б); *на мно$^{г}$ часте$^{s}$ дели$^{т}$сѧ присега ... **пе$^{р}$шаѧ** называе$^{т}$сѧ потве$^{р}$жа$^{л}$наѧ* (Зб. 261, 217б); ***пе$^{р}$шие**, и **дригие**, **третие** вызнали, але повѣди$^{ли}$, и$^{ж}$ пре$^{з}$ непи$^{л}$но$^{ст}$ сторожа тиремно$^{г}$ итеклъ* (Бельск., 373).

Да гэтай жа групы трэба далучыць і субстантываваныя колькасныя і парадкавыя лічэбнікі, якія ўжываюцца ў спалучэнні *один – другий* пры пералічэнні, проціпастаўленні або супастаўленні асоб, пра якіх ішла гаворка ў тэксце раней: ***ѡди$^{н}$** з роукъ вынѫ$^{л}$ гвозды а **дроугий** тело держа$^{л}$* (Пак. Хр., 14); ***ѡдинъ** за шію порыва$^{л}$ **дриги$^{s}$** мо$^{ц}$но би$^{л}$* (Зб. 107, 102б); ***ѡдинъ** былъ ве$^{л}$ми ласкавы$^{s}$ а **дриги$^{s}$** суровши$^{s}$ троху* (Пралог, 575б); ***одинъ** згинилъ, **дригій** в$^{s}$ вѫзеню зосталъ* (Хран., 69). Такія субстантываваныя лічэбнікі блізкія па значэнні да займеннікаў ‘нехта’ *і* ‘хтосьці іншы’.

Праведзены аналіз фактычнага матэрыялу паказаў асаблівасці як у частотным, так і ў жанрава-стылявым адлюстраванні зафіксаваных у ролі дзейніка парадкавых лічэбнікаў. Яны, у параўнанні з колькаснымі лічэбнікамі з той жа сінтаксічнай функцыяй, вызначаюцца значна меншай фіксацыяй. Сярод найбольш ужывальных вылучаюцца полісемічныя лексемы *перший, другий*, а таксама лічэбнікі *третий і четвертый*, што маюць найбольшую прадстаўленасць у літаратурна-пісьмовых крыніцах дзелавога жанру.

**Літаратура**

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 1–37 ; пад рэд. А. І. Жураўскага, А. М. Булыкі. – Мінск : Беларус. навука, 1982–2017.
2. Булыка, А. М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко ; АН БССР, Ін-т мовазнаўства. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 328 с.
3. Нарысы па гісторыі беларускай мовы : дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў / АН БССР, Ін-т мовазнаўства, пад рэд. П. Ф. Глебкі. – Мінск : Вучпедвыд, 1957. – 450 с.

***Спіс крыніц***

Апакр. – «Апакрысіс» (Вільня, 1598); АСД – Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, т. I–XIV. Вильна, 1867–1904; АЮЗР – Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, т. I–XV. СПб, 1863–1892; Барк. – «Баркалабаўскі летапіс» канца XVI–пачатку XVII ст. (рукапіс ДГМ); Бельск. – «Хроніка» М.Бельскага пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ); Дыяр. – «Дыярыуш» А.Філіповіча 1638–1643 гг. (рукапіс ДГМ); Зб. 261 – Зборнік павучанняў пачатку XVII ст. (рукапіс БАН Літвы); Зб. 107 – Зборнікі павучанняў сярэдзіны XVII ст. (рукапісы БАН Літвы); ИЮМ –

Историко-юридические материалы, извлеченные из архивных книг губерний Витебской и Могилевской, вып. I–XXXII. Витебск, 1871–1906; Каз. Кір. – «Казанне Кірыла» (Вільня, 1596); КВС – Кніга Віленскага замкавага суда 1552 г. (рукапіс ЦДАСА); Пак. Хр. – «Пакуты Хрыста» канца XV ст. (рукапіс РНБ); ПГ – Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в., т. I–IV. М., 1977–1982; Пралог – «Пралог» XVII ст. (рукапіс РДБ); Скар. – «Біблія» выдання Ф.Скарыны; ПП – Песні песням (Прага, 1516–1519); Ст. 1588 – Статут Вялікага княства Літоўскага (Вільня, 1588); Хр. польск. – «Кароткае апісанне хронікі польскай» пачатку XVII ст. (рукапіс РНБ); Хран. – «Хранограф» сярэдзіны XVII ст. (рукапіс РДБ); Царств. – «Аб царствах, краінах і розных землях» канца XVI ст. (рукапіс ДГМ).

*О. Б. Федоренко (Україна)*

## КУЛЬТУРНО-ІСТОРИЧНІ ВИТОКИ ОБРАЗУ КОЗАКА ХАРАКТЕРНИКА В УКРАЇНСЬКІЙ РОМАНІСТИЦІ XX СТОЛІТТЯ

Українське козацтво сконцентрувало в собі духовність нашого народу і передусім ідеї консолідації української нації, її незалежності та самостійності, і стало найактивнішим реалізатором цих, справді одухотворених, прагнень і задумів. Тож недарма серед козаків були люди не лише особливої вдачі, а й особливої самовідданості в боротьбі за високі ідеали українців. А надзвичайна і постійна напруга козака-воїна породжувала й унікальні здібності – люди відкривали в собі, окрім надзвичайної сили, ще й надзвичайні можливості, чим дивували не лише ворогів, а й саме козацтво. Так формувалися воїни-козаки з унікальними характерами, рисами, здібностями – характерники.

Образ унікального воїна існує в літературі різних країн. Так, у міфах Давньої Греції (II–I тис. до н. е.) розповідається про героїв (Геракла, Ахілла та інших), наділених надзвичайними здібностями [9]. Тобто обожнювалися незвичайні люди, що помітно виокремлювалися серед інших. Приписування магічної сили успішним людям було і в багатьох інших народів (культ «мана» у меланезійців тощо). Особлива каста воїнів-кшатріїв згадується в давньоіндійському епосі «Махабхараті» (IV–III ст. до н. е.), там же говориться про природну даність їхніх здібностей і рис характеру [1, с. 486]. А давньокитайські філософи, автори пам’ятки «Гуань-Цзи» (IV ст. до н. е.), високо цінували людей із потужною волею – «вмілих майстрів», здатних зосередити думки навіть у моменти вищого напруження й осягнути істину («далеке буде пізнане як близьке») [3, с. 32]. Пізніше Ібн Сіна (Авіценна) у книзі «Вказівки й настанови» (прибл. 1035–1036 рр.), говорячи про унікальних людей, підкреслює можливість пояснити їхні незвичайні діяння, «виходячи із законів природи» [6, с. 373]. Для прикладу він зазначає, що «містики» могли вимолити для людей дощ або зцілення, наслати затемнення чи землетрус, підкорювати звірів та інше [6, с. 379–380].

Головною причиною появи культурного феномена характерництва дослідники (А. Бондаренко, О. Боряк, А. Клос, М. Лановик, О. Найден, А. Поцелуйко) вважають безмежну віру воїнів у допомогу їм тотемів-заступників. Під час бою воїни здобували непереможність у процесі ініціацій, що було пов’язано з культом вовка, ведмедя як священних тварин.

У європейській історіографії та літературі такі воїни теж згадуються – це воїни-берсеркери [4, с. 41; 2, с. 15]. За словником, «берсеркер: «одягнений у ведмежу шкуру»; у північній сазі – воїн із силою та дикістю ведмедя; у переносному значенні – людина з незвичайною силою, несамовита і непереможна у бою» [15, S. 750]. Дослідивши ініціацію німецьких берсеркерів, Ф. Кардіні розповідає, що цих доблесних воїнів виокремлюють «люта відвага і невпинна воїнська сила»; такі войовники проявляють у бою надзвичайну ««харизму»,